# Заключная прамова Старшыні СНК БССР тав. Н. М. ГАЛАДЗЕДА.

Таварышы! Усе аратары пацвярджалі гіганцкія поспехі ў соцыялістычным будаўніцтве, якія мы мелі за 1935 год, і выказвалі сваю згоду з тымі заданнямі, якія вызначаюцца планам народнай гаспадаркі і культуры на 1936 год. Таму ў мяне няма патрэбы спыняцца на выступленнях асобных членаў ЦВК.

Усе члены ЦВК, у тым ліку і тыя, якія працуюць на мясцах, на фабрыках і заводах, у калгасах, у РВК, сельсоветах, акрвыканкомах, — усе яны, па-мойму, выказвалі адну думку: план сур'ёзны, размах бярэцца гіганцкі і наша задача заключаецца ў тым, каб мабілізаваць усе нашы сілы і гэты план не толькі выканаць, але і перавыканаць. **(Апладысменты).**

Таму я спынюся ў сваёй заключнай прамове толькі на некаторых асобных пытаннях.

Першае пытанне — гэта аб арганізацыйнай рабоце нашых наркаматаў, трэстаў і іншых гаспадарчых арганізацый у сувязі са стаханаўскім рухам.

У сваім дакладзе я падрабязна не развіваў гэтага пытання з-за эканоміі часу.

Падкрэсліваю, як аб гэтым я гаварыў у сваім дакладзе, што план 1936 года складзен з улікам стаханаўскага руху як па вытворчасці, так і па аб'ёму капітальнага будаўніцтва. Але, таварышы, адна справа скласці план, другая справа яго выканаць. Падкрэсліваю, што план разлічан на далейшы ўздым стаханаўскага руху.

Усім вядома, што ў час узнікнення стаханаўскага руху, і цяпер, калі прайшоў значны час пасля ўзнікнення стаханаўскага руху, пасля прамовы таварыша Сталіна і пасля пастаноў пленума ЦК ВКП(б), — не ўсюды яшчэ ў цэнтральных установах рэспублікі, сярод асобных гаспадарнікаў, савецкіх работнікаў і сярод інжынерна-тэхнічных работнікаў наглядаем мы належную раскачку для таго, каб узначаліць гэты стаханаўскі рух. Наадварот, мы яшчэ сустракаемся ў некаторых бюракратычных канцэлярыях з такімі людзьмі, якія не задаволены стаханаўскім рухам, бо ён некаторым бюракратам не па нутру, не падыходзіць. Яны прывыклі спакойна сядзець, пісаць паперкі, павольна рухацца, а стаханаўскі рух патрабуе ад усіх напружанай работы. Стаханаўцы патрабуюць канкрэтнага кіраўніцтва. Таму для іх стаханаўскі рух зваліўся як снег на галаву, і да гэтага часу з'яўляецца перашкодай для іх абывацельскага жыцця.

Нельга думаць, што адным загадам ці адной прамовай можна прымусіць перабудаваць работу такіх людзей. Не, таварышы, бюракратызм гэта такая заядлая рэч, што можа ўтапіць і вельмі сур'ёзную справу.

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

Значыць, задача заключаецца ў тым, каб зламаць супраціўленне і непаваротлівасць гэтых людзей, многім з іх дапамагчы перабудавацца, а калі яны не перабудуюцца ў сваёй рабоце, тады прыдзецца вызваляць нашы ўстановы ад такіх людзей, бо мы не можам лічыцца з людзьмі, якія не разумеюць гістарычнага значэння стаханаўскага руху.

Мы павінны адкрыць усе шляхі для шырокага разгортвання стаханаўскага руху і на кожным кроку дапамагаць стаханаўцам у іх рабоце, у іх жыцці. Мы павінны ламаць бюракратычныя перашкоды, якія тармозяць стаханаўскі рух.

Нашы наркаматы, нашы трэсты павінны сапраўды ператварыцца ў вытворча-тэхнічныя штабы па кіраванню вытворчасцю. Такая задача пастаўлена тав. Молатавым у яго дакладзе на сесіі ЦВК Саюза, каб наркаматы ператварыліся ў вытворча-тэхнічныя штабы. Але адна справа, таварышы, паставіць задачу, другая справа, як нашы цэнтральныя ўстановы перабудоўваюцца ў сваёй рабоце.

Некаторыя нашы ўстановы яшчэ не могуць пахваліцца такой перабудовай работы. І нават, калі мы складалі народнагаспадарчы план на 1936 год, то прышлося зверху, з боку Соўнаркома, націскаць на многіх людзей, прымушаць іх больш смела праектаваць вытворчыя заданні на 1936 год. І гэта не выпадкова, бо часта бюракраты з асобных апаратаў яшчэ маюць уплыў і на некаторых нашых кіраўнікоў. Аб гэтым трэба сказаць прама.

Нам прыдзецца ўвесь 1936 год весці работу так, каб не аслабляць нашай увагі да перабудовы работы цэнтральных установ. Мы будзем націскаць зверху на нашы кіруючыя гаспадарчыя арганізацыі і будзем дапамагаць ім перабудоўвацца. Апрача таго, гэты націск будзе ісці знізу, ад самых стаханаўцаў. Рабочыя-стаханаўцы таксама будуць падштурхваць нашы кіруючыя органы, каб яны паспявалі за стаханаўскім рухам у сваёй рабоце і каб працавалі больш канкрэтна і аператыўна.

Такім чынам, асноўная задача заключаецца ў тым, каб перабудаваць работу так, каб нашы цэнтральныя ўстановы былі сапраўднымі арганізатарамі стаханаўскага руху, а не з'яўляліся тормазам гэтага руху. Трэба мець на ўвазе, таварышы, што план 1936 года, які я вам далажыў, гэта мінімальны план, абавязковы для выканання пры любых умовах.

Мы ўпэўнены ў тым, што паспяховае разгортванне стаханаўскага руху павінна павялічыць рэзервы ва ўсіх галінах вытворчасці. І толькі тыя наркаматы, ці трэсты, таксама і іншыя цэнтральныя ўстановы, якія ў выніку сваёй аператыўнай дзейнасці на працягу года выявяць гэтыя новыя рэзервы і ўнясуць прапановы ў Соўнарком, каб павялічыць планы іх вытворчасці, — толькі такія наркаматы і ўстановы і будуць называцца аператыўнымі штабамі. А тыя ўстановы, якія будуць хныкаць аб тым, што нібыта для іх зацверджаны павялічаныя і напружаныя планы і яны планаў недавыканаюць, такія ўстановы не могуць прэтэндаваць называцца тэхнічна-вытворчымі штабамі.

А ў некаторых людзей з нашых цэнтральных установ існуе такі настрой: ці нельга адстаяць план паменшы, каб лягчэй працаваць, каб павольней жыць і ў той-жа час паказаць, што планы па яго ўстанове выконваюцца. Ёсць такія ў нас людзі, якія наровяць, ці нельга зменшыць напружанасць у іх рабоце.

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

Не, таварышы, нашы планы з'яўляюцца мінімальнымі планамі, і добрым кіраўніком трэста, кіраўніком цэнтральнай установы будзе той работнік, які з першага-ж месяца забяспечыць поўнае выкананне вызначаных планаў і на працягу года выявіць яшчэ дадатковыя рэзервы і рэсурсы, якія-б далі магчымасць перавыканаць планы, а можа быць і павялічыць іх на працягу года.

Не выпадкова таварыш Сталін у сваёй прамове, як і тав. Молатаў, падкрэсліваў, што нашы планы, якія мы ўстанаўляем, з'яўляюцца мінімальнымі, абавязковымі для выканання пры любых умовах. Так што, таварышы, у мяне ёсць надзея сустрэцца з такімі кіраўнікамі, якія, скажам, у сярэдзіне года прыдуць да нас з прапановамі павялічыць ім планы вытворчасці. **(Апладысменты).** Я лічу, што гэта надзея павінна апраўдацца, бо ў нас на чале гаспадарчых арганізацый стаяць большэвікі, а большэвікі не могуць задавольвацца маленькімі, лёгкімі планамі, тым больш, калі ўсе работнікі прымуць пад увагу словы таварыша Сталіна, сказаныя ім у 1933 годзе пры падвядзенні вынікаў першай пяцігодкі, аб тым, што, прыкладна, у сярэдзіне другой пяцігодкі створацца такія ўмовы, што мы атрымаем новы магутны разбег як у будаўніцтве, так і ў росце прадукцыі прамысловасці. Гэтыя словы ўжо ў 1935 годзе апраўдаліся, бо 1935 год быў пачаткам іменна такога новага магутнага разбегу.

Мне думаецца, што мы з упэўненасцю можам сказаць, што і ў нас, у БССР, 1936 год будзе на ўсіх галінах вытворчасці ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы сапраўды стаханаўскім годам. **(Апладысменты).**

Яшчэ адна задача — гэта дапамога стаханаўцам у павышэнні іх тэхнічных ведаў.

Вы чыталі пастанову пленума ЦК ВКП(б) пра задачы прамысловасці і транспарту ў сувязі з стаханаўскім рухам. Там сур'ёзнае месца аддаецца задачам тэхнічнай вучобы ўсяго рабочага класа. І гэта не выпадкова, таварышы, бо сам стаханаўскі рух нарадзіўся ў сувязі з тым, што рабочыя пачалі па-сапраўднаму авалодваць тэхнікай. Стаханаўцы, як гэта ўжо было прыведзена на стаханаўскай нарадзе ў Крэмле, здалі тэхмінімум на «выдатна». Гэта тыя людзі, якія аўладалі тэхнікай і атрымалі мінімум тэхнічных ведаў. Таму гэтыя людзі і з'явіліся застрэльшчыкамі стаханаўскага руху. Гэта першае.

Па-другое. Таварыш Сталін, характарызуючы пераход ад грамадства соцыялістычнага ў грамадства комуністычнае, напомніў нам аб тым, што толькі пры ўмове ліквідацыі розніцы паміж фізічнай і разумовай працай мы пяройдзем у комуністычнае грамадства. Прычым, гэта ліквідацыя розніцы паміж фізічнай і разумовай працай павінна ісці па лініі ўздыму тэхнічна-культурнага ўзроўню рабочага класа да тэхнічна-культурнага ўзроўню інжынераў і тэхнікаў. Я ўжо не гавару аб такой задачы, як павышэнне прадукцыйнасці працы, што таксама звязана з аўладаннем тэхнікай з боку рабочага класа і калгаснікаў. Таму ў пастанове пленума ЦК ВКП(б) пытанню тэхнічнай вучобы рабочага класа аддаецца такое вялікае месца.

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь
З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы